УДК 947.6:377

*А. М. Каспяровіч*

# ВЫКЛАДЧЫЦКІЯ КАДРЫ СЯРЭДНІХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ 20-х гг. XX ст.

Жыццёва важнай задачай пры стварэнні ў 20-х гг. XX ст. сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных установ было пытанне забеспячэння іх выкладчыцкімі кадрамі.. Вырашаць названую праблему прыходзілася ў надзвычай цяжкіх эканамічных умовах пасляваеннай разрухі і складанай грамадска-палітычнай сітуацыі першага дзесяцігоддзя савецкай улады.

У пачатку 20-х гг. у БССР меў месца недахоп працаўнікоў асветы, у тым ліку і выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Частка выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі ў выніку войнаў (1914—1920 гг.) апынулася за межамі Беларусі ці была прызвана ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі. Значная частка застаўшыхся паходзіла ў сваёй большасці са старой, яшчэ царскіх часоў, інтэлігенцыі, з якой далёка не ўсе лаяльна ставіліся да савецкай улады і жадалі працаваць у савецкай сістэме адукацыі.

Згодна штатных раскладаў тэхнікумаў, у 1920—1921 навучальным годзе ў іх павінна было працаваць 118 выкладчыкаў. У рэчаіснасці там займалася выкладчыцкай дзейнасцю 85 чалавек, што складала 72 % ад неабходнага [44, с. 35]. У сувязі з рэзкім павелічэннем ліку тэхнікумаў у наступным 1921—1922 навучальным годзе патрэба ў педагагічных кадрах для гэтых навучальных устаноў таксама рэзка ўзрасла, і наяўная колькасць выкладчыкаў ССНУ складала ўсяго 42 % ад неабходных па штаце [8, л. 261]. Такое становішча прывяло да таго, што некаторыя прадметы з вучэбнага плана зусім не выкладаліся. Так, у Слуцкім педагагічным тэхнікуме каля 12 % прадметаў у 1921 г., якія былі зацверджаны ў плане, не выкладаліся [ 27, л. 15].

Вышэйшымі дзяржаўнымі і партыйнымі органамі былі распрацаваны і пачалі ажыццяўляцца мерапрыемствы, накіраваныя на вырашэнне праблемы забеспячэння выкладчыцкім персаналам навучальных устаноў рэспублікі. Трывала забяспечыць патрэбы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у кадрах магла толькі падрыхтоўка іх праз вышэйшыя навучальныя ўстановы. Але пакуль у рэспубліцы толькі стваралася Вышэйшая школа. Патрэбна было знайсці іншыя крыніцы задавальнення патрэб ССНУ ў выкладчыцкіх кадрах, бо адкладваць стварэнне новых навучальных устаноў такога тыпу было немагчыма. Таму рэспубліканскія дзяржаўныя органы бачылі галоўнай крыніцай вырашэння кадравай праблемы ў ССНУ — прыцягненне да працы ў іх тых педагагічных работнікаў, хто па сваім адукцыйным ўзроўні мог там працаваць.

Адным з першых крокаў у гэтым кірунку было прыняцце 29 сакавіка 1920 г. Рэвалюцыйным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ваенным саветам Заходняга фронту пастановы аб адкамандзіраванні ў навучальныя ўстановы рэспублікі з вайсковых часцей, штабоў, упраўленняў і ўстаноў арміі ўсіх працаўнікоў асветы, за выключэннем службовых асоб каманднага саставу, а таксама асоб, якія працавалі выкладчыкамі ў ваенных школах [19, л. 134].

Каб паменшыць дэфіцыт педагагічнага персаналу, кіраўніцтва тэхнікумаў ішло на запрашэнне выкладчыкаў з воінскіх часцей, якія былі расквартэраваны ў адной з імі мясцовасці. Так, з 14 выкладчыкаў Бабруйскага політэхнікума ў 1920—1921 навучальным годзе, пяць было запрошана з воінскіх часцей, якія знаходзіліся ў горадзе [20, л. 11]. З трынаццаці выкладчыкаў Слуцкага педагагічнага тэхнікума трое сумяшчалі працу ў тэхнікуме з працай у ротных школах [27, л. 15]. Аналагічнае становішча назіралася ў іншых сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

Нягледзячы на тое, што названыя выкладчыкі не маглі стала працаваць у тэхнікумах у выніку таго, што вайсковыя часці мянялі сваю дыслакацыю, тым не менш, у абставінах вострага недахопу педагагічнага персаналу 1921—1922 г. гэтая часовая мера з'яўлялася значнай дапамогай у падтрымцы працы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Кіруючыя дзяржаўныя органы бачылі выхад з сітуацыі з забеспячэннем педкадрамі ССНУ ў прыняцці захадаў для прыцягвання працаўнікоў асветы да працы ў сістэме адукацыі з іншых устаноў рэспублікі, дзе яны працавалі не па спецыяльнасці. На другім Усебеларускім з'ездзе Саветаў у снежні 1920 г. па дакладзе аб народнай асвеце была прынята рэзалюцыя «Аб мерах да павелічэння ліку школьных работнікаў Беларусі», у якой шмат увагі надавалася пытанню ў камплектаванні выкладчыцкімі кадрамі навучальных устаноў рэспублікі. Так, згодна з адным з раздзелаў названай рэзалюцыі, пры Народным камісарыяце асветы былі створаны адпаведныя органы — тройкі, якія займаліся залучэннем культпрацаўнікоў з устаноў і накіраваннем іх на працу ў навучальныя ўстановы сістэмы адукацыі ў складзе прадстаўніка НКА, Кампрацы і Прэзідыума ЦВК. Такія ж тройкі былі ўтвораны ў паветах з прадстаўнікоў Нарадукацыі, Укампрацы і выканкомаў.

На з'ездзе было прынята рашэнне аб звароце да НКА РСФСР з хадайніцтвам аб адкамандзіраванні ў распараджэнне Наркамата асветы БССР работнікаў асветы, ураджэнцаў Беларусі. Было вырашана хадайнічаць перад Саветам Народных Камісараў РСФСР аб дазволе НКА Савецкай Беларусі звярнуцца з заклікам да школьных і іншых культурных работнікаў — ураджэнцаў Беларусі аб іх вяртанні з РСФСР у Беларусь для правядзення культурна-асветніцкай працы [45, с. 74—75].

У выкананне рашэнняў ІІ Усебеларускага з'езда Саветаў урадам БССР у пачатку 1921 г. быў прыняты Заклік да культурных працаўнікоў, ураджэнцаў Беларусі. Для стварэння сеткі школ, прафесійна-тэхнічных і культурных устаноў для ўсіх нацыянальнасцей у рэспубліку запрашаліся працаўнікі асветы, якія б ведалі край, яго прыроду, гаспадарку, гісторыю, мовы і ў той жа час маглі б прыняць удзел у камуністычным будаўніцтве [7, л. 56—57 ]. У дакуменце асабліва падкрэслівалася важнасць для народнай асветы рэспублікі работнікаў, якія маглі б працаваць на беларускай мове.

На другой сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР у пачатку лютага 1921 г. пытанню забеспячэння навучальных устаноў педагагічнымі кадрамі была ўдзелена належная ўвага. ЦВК пастанавіў прыняць усе неабходныя захады да вяртання працаўнікоў культуры на радзіму і асігнаваць сродкі ў памеры пяці мільёнаў рублёў на выдачу пад'ёмных [7, л. 59].

У лютым 1921 г. Саветам Народных Камісараў БССР па ўзгадненні з СНК РСФСР была прынята пастанова «Аб вяртанні ў межы Беларусі працаўнікоў культуры, ураджэнцаў Беларусі». Згодна з ёй, дазвалялася адкамандзіраванне выкладчыкаў, ураджэнцаў Беларусі, якія знаходзіліся на службе культасветы і іншых цывільных устаноў РСФСР і савецкіх рэспублік, у распараджэнне Народнага камісарыята асветы БССР. НКА БССР меў права адклікаць працаўнікоў асветы, якія раней займалі пасады ў сістэме адукацыі ў межах Беларусі, мелі навуковыя ці літаратурныя працы на беларускай мове ці прысвечаныя беларускаму жыццю і жадаючыя пераехаць у Беларусь. Усім савецкім установам прадпісвалася аказваць ім усялякае садзейнічанне ў пераездзе і перавозцы іх сям'і і маёмасці ў БССР [7, л. 58].

12 мая 1921 г. СНК РСФСР сваёй пастановай абавязаў наркаматы працы і асветы адкамандзіроўваць у распараджэнне НКА БССР усіх работнікаў асветы — ураджэнцаў Беларусі [39, с. 125].

Кіраўніцтва Наркамасветы і адміністрацыя асобных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў неаднаразова выступала перад СНК і Надзвычайнай Камісіяй БССР з хадайніцтвамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аб вызваленні выкладчыкаў тэхнікумаў і членаў іх сямей, якія знаходзіліся пад следствам ці былі асуджаны за службу ў палякаў, і вяртанні іх да працы ў тэхнікумах. Так, на імя старшыні СНК БССР А. Чарвякова ў лютым 1921 г. было накіравана хадайніцтва ад кіраўніцтва палітэхнікума аб вызваленні і вяртанні Цімафея Грудніцкага, выкладчыка названай установы, асуджанага пастановай калегіі Надзвычайнай Камісіі Беларусі за службу ў палякаў да адпраўкі ў канцэнтрацыйны лагер [10, л. 25]. У тым жа месяцы педагагічны савет палітэхнікума звярнуўся да Надзвычайнай Камісіі Беларусі з просьбай аб паскарэнні разбору справы і аб вызваленні з пад арышту жонкі выкладчыка Лавуцкага. У сувязі з яе арыштам ён быў вымушаны прыпыніць працу ў тэхнікуме, паколькі на яго руках засталося двое дзяцей — двух і трох гадоў і ён не меў ніякай прыслугі. Педсавет палітэхнікума запэўніваў, што ім добра вядома аб тым, што яна ніколі і ні ў якіх палітычных партыях не ўдзельнічала і, маючы на руках малалетніх дзяцей, займалася толькі хатняй гаспадаркай [32, л. 56].

Адным з захадаў па ўмацаванні педагагічнага складу сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў было прыцягненне да выкладання ў іх інжынераў розных спецыяльнасцей, аграномаў, тэхнікаў, працаваўшых на вытворчасці. Так, педагагічны персанал Беларускага Дзяржаўнага палітэхнікума ў 1920 г. амаль на 80 % складаўся з інжынераў розных спецыяльнасцей, большасць з якіх служылі ў савецкіх установах. Выкладаць у тэхнікуме яны маглі толькі пасля асноўнай працы — у вячэрнія часы [9, л. 34—35]. Больш за палову выкладчыкаў-інжынераў было ў 1921—1922 навучальным годзе ў педкалектыве Мінскага будаўнічага тэхнікума [23, л. 86]. У Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме ў тым жа навучальным годзе ўсе спецыяльныя прадметы выкладалі вучоныя аграномы [17, л. 5].

Кіраўніцтвам НКА БССР прымаліся адпаведныя захады па запрашэнні спецыялістаў з РСФСР. У 1921 г. на пастаянную работу ў Беларусь прыбылі выкладчыкі ВНУ Масквы і Петраграда. У іх ліку Б. К. Армфельд, В. І. Пераход, У. У. Шкацелаў. Вядомыя навукоўцы з Масквы Я. А. Заморын, М. В. Патапаў прыязджалі чытаць лекцыі па шэрагу спецыяльных дысцыплін [9, л. 34—35; 38, л. 73]. У 1921—1922 гг. яны вялі заняткі як у Беларускім політэхнічным інстытуце, так і ў рабочым тэхнікуме пры ім.

Для ўпарадкавання справы выкладання Галоўпрафадукацыі НКА БССР 8 мая 1923 г. пастанавіў замацаваць выкладчыкаў за педтэхнікумамі і «дазволіць ім толькі ў свабодны час прысвячаць сябе іншым навучальным установам» [33, л. 11].

Прынятыя ў пачатку 20-х гг. мерапрыемствы дапамаглі задаволіць мінімальныя патрэбы тэхнікумаў Савецкай Беларусі ў выкладчыцкіх кадрах і далі магчымасць функцыяніраваць гэтым установам у аднаўленчы перыяд (1921—1924 гг.). У выніку прынятых захадаў у Беларусь да канца 1921 — пачатку 1922 гг. вярнулася больш за 300 працаўнікоў асветы, з якіх каля 50 чалавек пачало працаваць выкладчыкамі ў сярэдніх спецыяльных установах рэспублікі. Сярод іх такія вядомыя дзеячы, як С. Некрашэвіч, М. Грамыка, М. Піятуховіч і інш. [2, с. 87; 40, с. 64, 68; 42, с.102—103; 24, л. 4, 30, л. 19].

Але аднымі спецыялістамі, якія былі падрыхтаваны да 1917 г., нельга было забяспечыць сетку ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Патрэбны былі свае рэспубліканскія ўстановы, якія б рыхтавалі педагагічныя кадры. Асноўнай крыніцай папаўнення выкладчыкамі тэхнікумаў рэспублікі быў БДУ. Пачынаючы з 1921 г. ён рыхтаваў выкладчыкаў для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. З 1924 г. педагагічны факультэт БДУ, выконваючы пастанову II сесіі Цэнтральнага выканаўчага камітэта саветаў БССР IV склікання «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі» пачаў рыхтаваць выкладчыкаў не толькі для беларускіх, але і яўрэйскіх і польскіх нацыянальных тэхнікумаў рэспублікі на іх родных мовах. З 1921 па 1926 гг. ім было падрыхтавана 273 выкладчыкі тэхнікумаў [27, л. 180]. Усяго ў перыяд з 1921 па 1930 гг. педагагічны факультэт БДУ скончыла 457 будучых выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў [2, с. 117].

З 11 снежня 1923 г. пачалі працаваць Вышэйшыя курсы беларусазнаўства, дзе праходзілі падрыхтоўку выкладчыкі беларускай мовы для тэхнікумаў і сямігадовых школ. Праца курсаў была цесна звязана з імёнамі вядомых навуковых супрацоўнікаў і педагогаў рэспублікі, як С. М. Васілеўскі, Д. А. Жарынаў, І. І. Замоцін, Якуб Колас, М. Н. Піятуховіч, А. У. Фядзюшын і інш. У 1924 г. Вышэйшыя курсы беларусазнаўства закончыла 45 чалавек, у 1925 г. — 75 і ў 1926 г. — 88 чалавек [35, л. 117, 191—192; 34, л. 1—2; 43, с. 122].

Развіццё сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пацягнула за сабой павелічэнне колькасці выкладчыцкіх кадраў. Аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 1*

**Змены ў колькасным складзе тэхнікумаў**

| Гады | Лік тэхнікумаў | Колькасць выкладчыкаў |
|---|---|---|
| 1921—1922 | 18 | 162 |
| 1922—1923 | 15 | 195 |
| 1923—1924 | 31 | 399 |
| 1924—1925 | 24 | 458 |
| 1925—1926 | 29 | 484 |
| 1926—1927 | 32 | 513 |
| 1927—1928 | 30 | 563 |
| 1928—1929 | 32 | 597 |
| 1929—1930 | 40 | 737 |

[*Падлічана па: 8; л. 261; 11; л. 230; 4; с. 49*]

зменах у колькасным складзе тэхнікумаў сведчыць табл. 1.

Так, з 1921 г. адбываўся пастаянны і стабільны рост колькасці выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, нават нягледзячы на часовыя скарачэнні колькасці саміх устаноў. Такое становішча можна растлумачыць тым, што ў выніку закрыцця адных тэхнікумаў астатнія даўкамплектоўваліся выкладчыкамі і выпускнікамі БДУ і вышэйшых курсаў беларусазнаўства. З 1921 па 1930 гг. колькасць выкладчыкаў тэхнікумаў узрасла ў 4,5 раза. Варта адзначыць, што найбольш значны рост выкладчыцкага складу сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў адзначаўся ў 1924 г., што было звязана з узбуйненнем тэрыторыі БССР, у выніку якога сетка сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і лік іх выкладчыкаў павялічыліся больш чым у два разы. Значным чынам выкладчыцкі склад ўзрос і ў канцы 1920-х гг., калі ў рэспубліцы назіралася хуткае павелічэнне колькасці тэхнікумаў.

Указаныя ў табліцы лічбы трэба лічыць прыблізнымі, бо ў названы перыяд часу значная колькасць выкладчыкаў з-за матэрыяльных прычын і наяўнасці вялікай колькасці вакантных месц у навучальных установах вымушана была працаваць адразу ў некалькіх.

Важным паказчыкам якаснага складу выкладчыкаў ССНУ быў іх адукацыйны ўзровень. У 20-я гг. XX ст. ён быў даволі высокім. У першую палову 20-х гг. XX ст. лік педагагічных работнікаў тэхнікумаў з вышэйшай адукацыяй складаў ад 65 да 73 %. З сярэдняй адукацыяй у ССНУ ў названы перыяд працавала каля 15 %, гэта былі ў асноўным выпускнікі былых настаўніцкіх семінарый, астатак — 10—15 працэнтаў дзялілі паміж сабой выпускнікі вайсковых школ і спецыялісты з вытворчасці [ падлічана па: 29, л. 55, 88; 31, л. 387—388; 43, с. 123—125]. Прычым некаторыя з выкладчыкаў мелі еўрапейскі ўзровень адукацыі. Так, у Польскім педагагічным тэхнікуме працавалі выкладчыкі, якія атрымалі адукацыю ва універсітэтах Парыжа, Варшавы, Кракава, Дыжона [29, л. 114]. У другой палове 20-х гг. лік выкладчыкаў ССНУ з вышэйшай адукацыяй павялічыўся за кошт выпускаў беларускіх ВНУ і складаў ад 61 да 78 % выкладчыкаў [13, л. 94; 5, л. 39]. У тэхнікумах БССР у 1920-я гг. выкладалі вядомыя грамадска-палітычныя і культурныя дзеячы культуры, як Язэп Лёсік, Якуб Колас, Уладзімір Волкаў — аўтар дзяржаўнага герба БССР.

Здавальняючым можна назваць і стаж педпрацаўнікоў ССНУ на працягу 1920-х гг. Так, першыя гады савецкай улады ў тэхнікумах БССР працавала 14 % выкладчыкаў, чый стаж перавышаў 20 гадоў, 16 % раўняўся стаж тых, хто працаваў у адукацыі 16—20 гадоў, стаж ад 6 да 15 гадоў мела пераважная большаць выкладчыкаў — больш за 58 % і лік тых, чый стаж быў меншы чым 5 год, быў роўны 12 % [11, л. 230; 12, л. 21; 4, с. 49—50; 41, с. 19]. З другой паловы 20-х гг. XX ст. адбывалася паступовае амаладжэнне педскладу тэхнікумаў. У названы перыяд у тэхнікумах працавала: 12,8 % тых, чый стаж быў 1—3 гады, 13,1 % са стажам 3—5 гадоў, 23,1 % складалі выкладчыкі са стажам 6—10 гадоў, 24 % — ад 11 да 15 гадоў, 15 % мелі стаж 16—20 гадоў і 12 % працавалі ва ўстановах адукацыі больш за 20 гадоў [15, л. 428—430; 26, л. 17; 27, л. 11].

У нацыянальным складзе выкладчыкаў ССНУ на працягу 20-х гг. XX ст. таксама адбыліся змены, звязаныя са змяненнем грамадска-палітычнага становішча ў рэспубліцы. Асноўным фактарам, які ўплываў на змены ў нацыянальным складзе выкладчыкаў тэхнікумаў Савецкай Беларусі ў 20-я гг., быў працэс беларусізацыі. У выніку прынятых захадаў па прыцягненні да выкладання педагогаў карэннай нацыянальнасці, перавядзення выкладання на беларускую мову і дзякуючы выпускам беларускага БДУ айчынных педкадраў для тэхнікумаў лік беларусаў сярод выкладчыкаў названых навучальных устаноў на працягу 20-х гг. паступова ўзрастаў. Дынаміка змен у нацыянальным складзе выкладчыцкіх кадраў ССНУ змешчана ў табл. 2 [41, с. 19; 29, л. 50, 56, 101, 103, 114; 36, л. 65; 37, л. 26; 5, л. 39; 11, л. 230].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нягледзячы на тое што пры правядзенні беларусізацыі быў абвешчаны прынцып карэнізацыі — першачарговага прыёму на працу выкладчыкаў беларусаў, выканаць гэта на справе аказалася даволі складана. З пачаткам беларусізацыі тэхнікумаў у 1926—1927 гг. выявілася, што выкладчыкаў, якія валодалі беларускай мовай на ўзроўні выкладання, было мала. Не спрыяла правядзенню палітыкі карэнізацыі і тое, што саміх выкладчыкаў ССНУ на працягу даследуемага перыяду не хапала. Таму пры прыёме на выкладчыцкую працу ў тэхнікумы ў першую чаргу звярталася ўвага на адукацыю працаўніка і яго магчымасць працаваць.

Для станоўчай працы выкладчыкаў было неабходна вырашыць пытанне іх матэрыяльнага забеспячэння. У пачатку 1920-х гг. выкладчыцкі склад сярэдніх спецыяльных устаноў, як і ўсе працаўнікі асветы БССР, знаходзіўся ў катастрафічным стане. Выключэнне складалі толькі выкладчыкі-інжынеры, якія дзякуючы асноўнай працы на вытворчасці маглі ў нейкай ступені забяспечыць свае матэрыяльныя патрэбы. Так, амаль што ўсю вясну 1921 г. выкладчыкі тэхнікумаў не атрымлівалі жалавання, хлебны паёк выдаваўся нерэгулярна, больш за палову выкладчыцкага складу было вымушана жыць за кошт мясцовага насельніцтва. Паёк працаўнікам асветы ў 1920—1921 навучальным годзе раўняўся 1—2 пудам жыта ў месяц [11, л. 199].

Цяжкі стан працаўнікоў асветы быў абмеркаваны на пасяджэнні Цэнтральнага Бюро КПБ 20 мая 1921 г., дзе было прынята рашэнне даручыць Народнаму камісарыяту харчавання праводзіць забеспячэнне выкладчыкаў за кошт мясцовых сродкаў праз павятовыя выканаўчыя камітэты [6, л. 72]. 15 верасня 1921 г. дэкрэтам СНК БССР было ўведзена самаабкладанне насельніцтва на патрэбы народнай адукацыі па ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Згодна з ім, норма прадуктовага пайка працаўніка асветы была павялічана. У 1921—1922 навучальным годзе яна склала 2—3 пуды жыта, 2 пуды бульбы, 2 фунты жыроў, плюс 50 % гадавога пайка на гаспадарчыя патрэбы. У 1922—1923 навучальным годзе прадуктовы паёк значна ўзрос і складаў ужо 10—15 пудоў у вёсцы і 15—25 пудоў у горадзе. Разам з тым адзначалася, што нават гэтыя павышаныя нормы далёка не дасягалі пражытачнага мінімуму [21, л. 6].

У тэхнікумах, якія знаходзіліся на дзяржаўным утрыманні, з 1922 г. выкладчыкі акрамя прадуктовага пайка пачалі атрымліваць і заработную плату грашыма. Так, у канцы 1922 г. выкладчыкі Мар'інагорскага сельскагаспадарчага тэхнікума атрымоўвалі 700.000 старых рублёў ці 4 руб. 60 кап. золатам — у савецкіх залатых чырвонцах 1922 г. У цэлым жа ў 1922—1923 навучальным годзе зарплата выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў вагалася ад 630.000 да 2.000.000 руб. (4 руб. 20 кап. — 13 руб. 30 кап. золатам) [23, л. 37; 86, 88; 90, 173].

*Табліца 2*

**Змены ў нацыянальным складзе выкладчыкаў**

| Гады | Беларусы | Яўрэі | Палякі | Рускія | Іншыя |
|---|---|---|---|---|---|
| 1921—1924 | 44,6 | 34,7 | 9,9 | 9,3 | 1,5 |
| 1925—1926 | 47,2 | 30,5 | 9,5 | 7,1 | 5,7 |
| 1927—1928 | 53 | 24 | 13 | 5 | 5 |
| 1929—1930 | 63,8 | 18,8 | 6,6 | 8,3 | 2,5 |

Такая няроўнасць у заработнай плаце тлумачылася тым, што не было адзінай сістэмы тарыфікацыі выкладчыкаў тэхнікумаў. Так, у Мінскім індустрыяльным тэхнікуме выкладчыцкі персанал атрымоўваў жалаванне па стаўках ВНУ: у месяц па стаўках 2-й катэгорыі — 7 руб. 63 кап. за 10 гадзін у нядзелю, па 3-й катэгорыі — 6 руб. 10 кап. за 16 гадзін. У тэхнікумах, якія існавалі на сродкі ад самаабкладання бацькоў вучняў, заработная плата складала каля 10—12 рублёў у месяц, пры 18 гадзінах у нядзелю [21, л. 13—14]. Пражытачны мінімум на аднаго чалавека ў месяц, які ўключаў у сябе выдаткі на прадукты харчавання, адзенне, абутак, жыллё і культурныя патрэбы па цэнах 1922 г., складаў 46,5 руб. [25, л. 46].

Для падтрымкі педагагічных работнікаў 23 лістапада 1922 г. на пасяджэнні калегіі НКА БССР было вырашана вызваліць дзяцей работнікаў асветы ад усіх расходаў, звязаных з уведзенай часова абавязковай дапамогай бацькоў школе і прадаставіць ільготы пры залічэнні іх у тэхнікумы і ВНУ [22, л. 173].

Педагогі многіх сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў мелі права набываць прадукты і прамысловыя тавары ў спецыяльных крамах, дзе цэны былі ў 2—3 разы ніжэй за рыначныя. У 1923—1924 навучальным годзе выкладчыкі тэхнікумаў сталі атрымоўваць у сярэднім 26 руб. у месяц [27, л. 24].

1 ліпеня 1925 г. была прынята Пастанова СНК БССР «Аб мінімальных нормах нагрузкі педагагічнага складу ў культурна-асветніцкіх установах, падпарадкаваных НКА». Згодна з ёй, мінімальная норма нагрузкі для выкладчыкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

усіх тэхнікумаў рэспублікі была вызначана у памеры 12 нядзельных гадзін [14, л. 115—116]. За названую стаўку быў вызначаны месячны аклад у 43 руб. 40 кап. З гэтага часу зарплата выкладчыкаў стала фіксаванай для ўсіх тыпаў тэхнікумаў.

З мэтай паляпшэння матэрыяльнага забеспячэння педагагічных работнікаў 4 ліпеня 1925 г. на распарадчым пасяджэнні СНК БССР была прынята пастанова, згодна з якой яны павінны атрымоўваць зарплату на ўвесь час летніх канікулаў з разліку іх сярэдняй заработнай платы [4, с. 24].

У наступныя гады ў сувязі з паляпшэннем фінансава-эканамічнага становішча рэспублікі адбываўся паступовы рост заработнай платы выкладчыкаў тэхнікумаў. Так, у 1925—1926 навучальным годзе яна была павялічана да 62 руб. 50 кап., у 1926—1927 — склала 65 руб., а ў 1927—1928 раўнялася ўжо 70—75 руб. [27, л. 24]. У 1928—1929 навучальным годзе жалаванне выкладчыкам дасягнула 110 руб. у месяц пры 12 гадзінах выкладання ў нядзелю [41, с. 19]. Для параўнання : у канцы 20-х гг. прафесар атрымоўваў месячны аклад у памеры 250 руб. за 6 гадзін выкладання, выкладчык прафесійнатэхнічнай школы — 80 руб., настаўнік у 7-гадовай школе — 70 руб., студэнт ССНУ атрымоўваў 25 руб. стыпендыі. Пачынаючы з сярэдзіны 20-х гг. заработная плата выкладчыкам тэхнікумаў выплачвалася акуратна, і была ліквідавана такая з'ява, як запазычанасць.

Тым не менш, нягледзячы на пастаянны рост заработнай платы выкладчыкаў, праблема іх матэрыяльнага забеспячэння да канца не была вырашана. Узровень зарплаты выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў не дазваляў ім таксама ў поўнай ступені сканцэнтравацца на сваёй выкладчыцкай дзейнасці. Такое становішча не лепшым чынам адбівалася на вучэбна-выхаваўчым працэсе. Так, спецыялісты з вытворчасці, якія ў індустрыяльных, прамыслова-эканамічных і сельскагаспадарчых тэхнікумах складалі ў сярэднім ад 30 да 40 % выкладчыцкага складу, не жадалі пераходзіць на сталую працу ў навучальныя ўстановы з-за невысокага заробку. Гэта тычылася і пастаянных выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія былі вымушаны браць гадзіны для выкладання ў розных навучальных установах адначасова. Такі расклад прыводзіў да таго, што нават у канцы 20-х гг. выкладчыкі з вытворчасці, якія складалі значны працэнт педагагічнага персаналу тэхнікумаў, маглі працаваць у названых навучальных установах амаль выключна вечарам. У выніку — заняткі ў многіх тэхнікумах цягнуліся на працягу цэлага дня, працоўны дзень студэнтаў і выкладчыкаў быў разбіты, і яны дарэмна марнавалі шмат часу на «вокны». У шэрагу тэхнікумаў па прычыне недахопу выкладчыкаў некаторыя, асабліва спецыяльныя дысцыпліны, зусім не выкладаліся, ці выкладаліся неспецыялістамі патрэбнага профілю. Так, існуе нават такі факт, што ў Краснабярэжскім аграпедтэхнікуме ў 1926—1927 навучальным годзе матэматыку выкладаў настаўнік беларускай мовы і літаратуры [28, л. 60—62].

Такім чынам, у першыя пасляваенныя гады палітыка Камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы была ў першую чаргу скіравана на забеспячэнне выкладчыцкімі кадрамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і стварэнне належных умоў, неабходных для іх жыцця і працы. Між тым партыйнае кіраўніцтва краіны добра разумела ролю выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у выхаванні падрастаючай змены. Таму пачынаючы з 1921 г. кіраўніцтвам кампартыі прымаліся ўсе магчымыя захады па «ўмацаванні» выкладчыцкага складу сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў прадстаўнікамі камуністычнай партыі і камсамольцамі. Так, 25 красавіка 1921 г. на пасяджэнні сельскагаспадарчай секцыі Галоўпрафасветы НКА пасля праверкі працы сельскагаспадарчых тэхнікумаў Савецкай Беларусі было вырашана адправіць туды добра падрыхтаваных марксістаў — выкладчыкаў палітграматы [17, л.14—15]. На VII з'ездзе КП(б)Б (сакавік 1923 г.) «у мэтах засцярогі падрастаючага маладога пакалення ад заражэння нэпаўскай ідэалогіяй і сістэматычнага выхавання моладзі ў камуністычным духу» былі намечаны наступныя мерапрыемствы, што тычыліся выкладчыцкага складу сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў: узмацніць увагу партыі на кіраўнічыя адміністрацыйныя і вучэбныя органы гэтых устаноў, выкладчыцкі склад, шляхам аб'яднання камуністычных навукова-выкладчыцкіх сіл, паслаць дастаткова падрыхтаваных камуністаў у якасці выкладчыкаў, пашырыць і паглыбіць вывучэнне грамадскіх дысцыплін [3, с. 149].

Асаблівую ўвагу кіраўніцтва краіны надавала выкладчыкам грамадскіх дысцыплін. Партыйная палітыка ў гэтым пытанні была накіравана на фарміраванне складу выкладчыкаў грамадска-палітычных дысцыплін выключна з членаў партыі. У аднаўленчы перы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яд (1921—1924 гг.), калі толькі пачыналася фарміраванне дадзенага падыходу, камуністы сярод выкладчыкаў грамадска-палітычных дысцыплін тэхнікумаў складалі 20—23 % [17, л. 14, 15; 18, л. 13, 15, 16]. З сярэдзіны 1920-х гг. лік камуністаў сярод выкладчыкаў грамадска-палітычных дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў павялічваўся наступным чынам: у 1925—1926 навучальным годзе яны складалі 30—34 %; у 1926—1927 — 50 %; 1927—1928 — 74 %; у 1929—1930 навучальным годзе — 94 % [26, л. 127; 15, л. 428—430].

Важным кірункам у працы па «палітычным заваяванні» сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў лічылася павелічэнне ліку камуністаў у іх кіраўніцтве. Дзякуючы такой палітыцы працэнт партыйных сярод работнікаў кіраўнічага і адміністрацыйнага апарату тэхнікумаў за названы перыяд узрос з 11 % у 1921 г. да 75 % у 1929 годзе [26. л. 127; 15, л. 428—430].

Працэс павелічэння прадстаўнікоў Камуністычнай партыі ў выкладчыцкім корпусе сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на працягу 1920-х гг. ішоў даволі марудна. Аб значным павелічэнні партыйна-камсамольскага ядра ў тэхнікумах рэспублікі і ўзрастанні іх уплыву на студэнцтва і вучэбна-выхаваўчы працэс можна гаварыць толькі з другой паловы 20-х гг. У аднаўленчы перыяд лік выкладчыкаў-камуністаў павялічыўся вельмі нязначна — з 6,5 % у 1921 г. да 8 % у 1924 г. адпаведна [падлічана па: 11, л. 188, 201; 16, л. 21; 17, л. 9]. У выніку прынятых захадаў з 1925 г. у асноўным за кошт прыцягнення ў ССНУ камуністаў — выкладчыкаў грамадска-палітычных дысцыплін і камуністаў — кіраўнікоў і адміністратараў удалося значна павялічыць іх колькасць сярод выкладчыкаў. У педагагічных тэхнікумах назіраўся найбольш высокі ў той час працэнт выкладчыкаў з камуністаў-камсамольцаў. Яго педсклад у 1927—1928 навучальным годзе выглядаў наступным чынам: членаў і кандыдатаў КП(б)Б — 17,1 %, членаў ЛКСМ — 1,3 %, беспартыйных — 81,6 % [26, л. 128]. Ва ўсіх іншых тэхнікумах гэтыя паказчыкі былі ніжэйшымі [26, л. 129; 15, л. 430]. Такім чынам, па ўсіх тыпах тэхнікумаў БССР лік партыйцаў сярод выкладчыкаў складаў каля 19 % у 1929—1930 навучальным годзе [падлічана па: 26 л. 127; 15, л. 428—430 ; 1, с. 29].

У выніку неабходна адзначыць, што фарміраванне складу выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў адбывалася ў цяжкія часы пасляваеннай разрухі. Тым не менш на працягу 1920-х гг. удалося не толькі забяспечыць, хоць і па мінімуму, патрэбы ў выкладчыках сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, але і да канца адзначанага перыяду павялічыць іх колькасць у сувязі з узрослымі патрэбамі народнай адукацыі. Паколькі спецыялістамі дарэвалюцыйнай школы нельга было задаволіць усё ўзрастаючай патрэбы ў выкладчыцкіх кадрах, то практычна з першага пасляваеннага года ўдалося наладзіць падрыхтоўку айчынных кадраў у БДУ. Намеціліся станоўчыя тэндэнцыі ў падрыхтоўцы выкладчыкаў для выкладання на беларускай мове і мовах нацыянальных меншасцей. Кваліфікацыя выкладчыцкага складу тэхнікумаў была высокай, што дазваляла праводзіць заняткі (за малым выключэннем) на здавальняючым узроўні.

Разам з тым не ў дастатковай ступені забяспечаныя выкладчыкі былі вымушаны працаваць адразу ў некалькіх навучальных установах, што не лепшым чынам адбівалася на вучэбным працэсе. Да заідэалагізаванасці выкладання грамадскіх дысцыплін прывяло імкненне вышэйшых партыйных органаў забяспечыць іх выкладчыкамі-партыйцамі амаль на сто парцэнтаў.

*Літаратура і крыніцы*

1. З абследавання Віцебскага палітэхнікума // Асвета. 1929. № 3.
2. *Ильюшин И. М., Умрейко С. А.* Народное образование в Белорусской ССР. Мн., 1961.
3. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Мн., 1981, Т. 1.
4. Культурно-просветительские учреждения БССР // Бюллетень Центрального статистического управления. Мн., 1925. № 1—3.
5. НА РБ ф. 4, вол. 7, спр. 141.
6. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 4.
7. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 5.
8. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 15
9. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 17.
10. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 29.
11. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 194.
12. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 278.
13. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 308.
14. НА РБ ф. 6, воп. 1, спр. 565.
15. НА РБ ф. 7, воп. 1, спр. 771.
16. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 53.
17. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 58.
18. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 59.
19. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 89.
20. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 113.
21. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 118.
22. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 125.
23. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 154.
24. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 156.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 157.
26. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 316.
27. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 318.
28. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 321.
29. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 326.
30. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 344.
31. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1152.
32. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1153.
33. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1181.
34. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1208.
35. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1467.
36. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1705.
37. НА РБ ф. 42, воп. 1, спр. 1846.
38. НА РБ ф. 210, воп. 1, спр. 6.
39. Народное образование в БССР : сб. док. и материалов. 1917—1927 . Мн.,1979. Т. 1.
40. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968.
41. Настаўніцтва // Чырвоны тэхнік. Мн., 1929.
42. *Новик Е. К.* Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917—1941). Мн., 1981.
43. Праца польскага педагагічнага тэхнікума ў Мінску і яе сучасныя вынікі // Асвета. Мн., 1925. № 5.
44. Профессионально-техническое образование // Вестник Народного комиссариата просвещения. Мн., 1921. № 2.
45. Резолюция ІІ-го Всебелорусского съезда советов по докладу о народном просвещении // Школа и культура Советской Белоруссии. Мн., 1921. № 1—2.

SUMMARY

*The article deals with the problem of teaching staff formation in secondary special educational institutions of Soviet Belarus in the 20-ies of the XX th century.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ